# Кацярынін «Карагод»

ПРАКАВЕТНАЕ





Дзякуючы **Кацярыне Аляксееўне ПАНЧЭНІ** і жыхарам вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна, на прыпяцкім Палессі захаваўся і працягваецца веснавы абрад «Юр'е» — адзін з самых старажытных у земляробчым календары ўсходнеславянскіх тэрыторый. Менавіта па традыцыі святкаваць «Юр'е» ведаюць у нашай краіне і саму вёску, і яе захавальнікаў — гурт «Міжрэчча» з ягоным нязменным кіраўніком. Восем гадоў таму ў вёсцы паставілі знак у гонар абраду, які ўнесены ў спіс нематэрыяльных культурна-гістарычных каштоўнасцяў.







Кожны год шостага мая мае калегі — фотакарэспандэнты і тэлеаператары з'язджаюцца ў вёску да хаты Кацярыны Аляксееўны, каб здымаць і паказваць надзвычай прыгожае і вясёлае дзейства — «карагод». Падчас свята ў хаце 77-гадовай паляшучкі не было вольнага месца — многія хацелі пабачыць і сфатаграфаваць пачатак абраду — упрыгожванне каравая рознакаляровымі папяровымі і жывымі кветкамі. Пірог-каравай напярэдадні выпекла сама гаспадыня, і называецца ён таксама — «карагод». Пад абрадавую песню: «Карагод, карагод, мы цябе наражаем! Цябе наражаем, Бога праслаўляем!..», жанчыны «прыбіраюць» галоўны атрыбут свята і выбіраюць «ваяводу», які і панясе каравай праз усю вёску. Не першы раз на пасаду ваяводы зноў абралі паважанага ў акрузе чалавека — **старшыню Азяранскага сельсавета Міхаіла АЛІФІРАЎЦА**.



І вось «карагод» нясуць у поле, дзе рунее жыта, каб «абрачыся» *(даць зарок)* перад галоўным апекуном земляробаў, урадлівасці і плоднасці глебы — Юр'ем. Па павер'ях, у гэты дзень святы Юр'я бярэ ў Бога ключы і адмыкае зямлю. «Святы Юрай — божы ключнік», — кажуць на Тураўшчыне і дадаюць: «Адмыкай зямлю, выпускай расу на цёплую зямлю, на буйное жыта!» Удзельнікі праходзяць пад ручніком, сыплюць зерне і бяруцца за рукі — водзяць карагод.

Заключная частка свята — абыход вёскі. Гаспадары выходзяць на вуліцу і чакаюць Кацярынін «карагод». Вясёлае войска на чале з ваяводам абавязкова паспявае пакарагодзіць і гаспадарам — бо гэта шчаслівы знак.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

***Больш здымкаў з гэтага свята глядзіце на сайце «Звязды» — zviazda.by.***

# Пад аховай нябеснай заступніцы

**Напярэдадні 100-гадовага юбілею магілёўскай міліцыі ўпраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама атрымала харугву з абліччам Бялыніцкай іконы Божай Маці.**

Гэта сімвалічная падзея адбылася падчас урачыстага мітынгу супрацоўнікаў міліцыі на месцы подзвігу капітана Канстанціна Уладзімірава і яго байцоў з батальёна міліцыі, якія ў пачатку вайны да апошняга ўздыху абаранялі гэты рубеж каля вёскі Гаі. Са словамі малітвы і духоўнага наказу **кіраўнік ваеннага аддзела Магілёўскай епархіі протаіерэй СЕРГІЙ** перадаў святыню **начальніку ўпраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама палкоўніку міліцыі Ігару ШЧАРБАЧЭНЮ**. Ігар Шчарбачэня адзначыў, што атрыманне гэтага дару — знакавая падзея для міліцыі, якая будзе садзейнічаць духоўнаму яднанню супрацоўнікаў у справе абароны вечных каштоўнасцяў грамадства — міру, дабра і справядлівасці.

На мітынгу былі адзначаны ўзнагародамі найлепшыя па службе. Нагрудны памятны знак «100 год магілёўскай міліцыі» атрымаў і **ветэран Вялікай Айчыннай вайны палкоўнік міліцыі ў адстаўцы Мікалай ІЛЬКЕВІЧ**. Міліцыянеры таксама ўшанавалі хвілінай маўчання памяць герояў Вялікай Айчыннай вайны і ўсклалі кветкі да помніка байцам батальёна міліцыі капітана Уладзімірава.

***Нэлі ЗІГУЛЯ.***

